# ВЫХАВАЎЧАЕ ЗНАЧЭННЕ КАЗАК УЛАДЗІМІРА КАРАТКЕВІЧА

**Андрон С.С., выпускніца**
(г. Полацк, Полацкі каледж ВДУ імя П.М. Машэрава)
Навуковы кіраўнік – Аляксеенка В.А., выкладчык

Невыпадкова казкі прысутнічаюць у жыцці чалавека з самага дзяцінства. Добрыя, вясёлыя і павучальныя яны на доўгія гады становяцца нашымі сябрамі, дарадчыкамі ў розных жыццёвых сітуацыях. Казачныя героі дапамагаюць вучыцца адрозніваць дабро ад зла, праўду ад хлусні, стаць чэснымі, смелымі, справядлівымі. У казкі нашы продкі ўклалі ўвесь свой вопыт, веды і мудрасць. Казачныя героі мінулага і ў наш час працягваюць садзейнічаць выхаванню маральных і патрыятычных каштоўнасцей чалавека XXI стагоддзя.

Фальклорныя казкі, апрацаваныя майстрамі слова, у нашым жыцці з'яўляюцца сапраўдным скарбам народнай педагогікі. Аб гэтым шмат гаварылі класікі рускай і беларускай літаратуры, пісьменнікі-педагогі Чарнышэўскі М.А., Сухамлінскі В.А., Якуб Колас, Алесь Якімовіч, Васіль Вітка.

Час не стаіць на месцы. Новы час патрабуе новых герояў. Няўжо казкі зжылі сябе? А што пакінем мы сваім нашчадкам, якія духоўныя нормы, пастулаты. Ці зберажом тое, што засталося ад нашых продкаў? Абавязкова захаваем! А можа, што і сваё створым? Чаму не? Гэта можа быць літаратурная казка, і апрацаваная народная, і на сучасную тэматыку, з новымі героямі.

Вырашыла пашукаць адказу на пытанне ў казках любімага мною пісьменніка Уладзіміра Караткевіча. Чаму? Па-першае, ён, на мой погляд, як вядучы аўтар гістарычнай тэмы ў беларускай літаратуры, вывучаў народныя казкі, уключаў у свае творы, перапрацоўваў. Па-другое, гэта пісьменнік, які валодаў дарам прадбачання, умеў зазірнуць далёка наперад і вучыў, супастаўляў, параўноўваў.

Звычайна казачны жанр пад сілу ці жыццёва ўмудроным пісьменнікам, ці ўзроставым, за плячыма якіх гады, а ў пісьменніцкай скарбонцы запісы, задумкі, планы, якія чакаюць, каб стаць чарговым шэдэўрам. Напрыклад, Якуб Колас першую казку напісаў яшчэ ў далёкім 1907 годзе, апошняя была запісана за год да смерці ў 1955 годзе. Алесь Якімовіч заняўся апрацоўкай беларускіх народных казак, калі яму было за 40 гадоў.

Караткевіч таксама доўга рыхтаваў сябе да таго, каб "замахнуцца" на жанр казкі, які ён лічыў вельмі складаным. Паспрабаваў у 1952 годзе (тады яму было ўсяго 22 гады), калі напісаў "Лебядзіны скіт". Яна разам з казкамі "Вужыная каралева", "Аўтух-дамоўнік", "Казка пра Пятра-разбойніка", "Надзвычайная котка", "Мужык і дзіва аднавокае" "З вобразаў казак" увайшла ў зборнік пад назвай "Казкі і легенды маёй радзімы". Далей Караткевіч даслаў іх для аналізу Якубу Коласу, які заўважыў іх адметнасць і адзначыў прыбліжанасць да народных.

Потым выпускнік Кіеўскага ўніверсітэта Караткевіч напісаў дыпломную працу пра сацыяльныя казкі і легенды ва ўсходнеславянскім фальклоры. Гэтая грунтоўная работа дапамагла засвоіць казачныя сюжэты, вобразы, матывы, народную мараль і этыку. Яна стала падмуркам для напісання наступных уласных аўтарскіх казак.

Казкі Уладзіміра Караткевіча, як і ўсё, напісанае ім, – кладзезь мудрасці, настольная кніга, жыццёвыя дарадчыкі і надзейныя сябры. Пісьменнік добра разумеў, што казка павінна выхоўваць, фарміраваць любоў да радзімы, да беларускай мовы. Яна захапляе чытача, выклікае ў яго глыбокія пачуцці, штосьці падказвае, чамусьці вучыць. Таму Уладзімір Караткевіч, ствараючы свае казкі, абапіраўся на народную мудрасць, духоўныя каштоўнасці продкаў.

Рэпазіторый ВДУ

Казкі Караткевіча дапамагаюць данесці да маленькіх жыхароў сучаснай Беларусі важнейшыя чалавечыя законы, ісціны: павагу да старэйшых, клопат пра бліжняга, працавітасць, добразычлівасць.

Разгледзім выхаваўчыя магчымасці казак У. Караткевіча на прыкладзе твораў, уключаных у школьную праграму.

Казка "*Жабкі і Чарапаха*" з'яўляецца адной з апошніх аўтарскіх казак У. Караткевіча. Тэкст надрукаваны 1 жніўся 1980 года ў часопісе "Вясёлка". Разам з маленькімі чытачамі пісьменнік разважае на філасофскія тэмы пра сэнс жыцця, пра прызначэнне чалавека на Зямлі, гаворыць аб сабе, аб тых, хто побач з намі, якія мы.

"Зялёныя", "бліскучыя", "як лакіраваныя" жабкі лічаць сябе прыгожымі, а з Чарапахі насміхаюцца, бо яна не такая, як яны, а "карычневая", "цвёрдая", "са шчытом", "бы жалезная".

Чарапаха – сама інтэлігентнасць, дабрыня- надзвычай мудра (ў яе вусны аўтар уклаў свае думкі) заяўляе: "Жывыя – усе прыгожыя".

Чарапаха выхаваная, ветлівая. Аб гэтым сведчыць яе прывітанне, падбор слоў у размове ("каб толькі не пакрыўдзіліся жабкі"). Гаворыць яна, абдумваючы кожнае слова, ціха, спакойна, упэўнена. Жабкі ж наадварот, балбочуць не змаўкаючы, усё, што ўзбрыдзе ў галаву. Ім некалі (ды і навошта?) думаць ці не пакрыўдзіцца Чарапаха.

Казка мудрая. Пісьменнік сцвярджае разнастайнасць і прыгажосць прыродных формаў, а таксама неабходнасць вучыцца бачыць у нязвыклым прыгажосць, цаніць і разумець іншага, не падобнага на цябе. Талерантныя, добразычлівыя адносіны хоча сфарміраваць казачнік у маленькіх слухачоў: «І навошта, калі ты зялёны і мяккі, лаяць таго, хто карычневы і цвёрды? Ты вось ходзіш на дзвюх нагах, а кот – на чатырох. І няхай сабе. Дрэнна вы зрабілі, жабы. Ану, марш адразу ў Чарапахі прабачэння прасіць, перапрашаць яе! Гэта прапанова, пажаданне, а мо і загад!

У 4 класе вывучаецца беларуская народная казка "Стары бацька", казка У. Караткевіча "*Нямоглы бацька*" – у 5 класе. Выхаваўчыя мэты іх супадаюць: вучыць паважаць і слухаць старэйшых. Сюжэт ўзяты з фальклору: сын пашкадаваў свайго бацьку і не адвёз старога ў лес паміраць як іншыя людзі. Той, у сваю чаргу, дзякуючы вялікай мудрасці і жыццёваму вопыту, выратаваў сына і яго сям'ю ў цяжкі час: дапамог пасадзіць жыта, расказаў, дзе знайсці грошы на хлеб. "З таго часу перасталі людзі адвозіць старых паміраць, а пачалі пакідаць да сябе".

Казка пакідае моцныя ўражанні. І дае жыцёвыя ўрокі. Вось яны: Законы, калі яны неразумныя, трэба мяняць. Казка заканчваецца словамі: "І так памёр Закон стары. І так стаў новы Закон". З нягоднікамі трэба змагацца. За ўсе на свеце трэба плаціць.Нельга жыць сённяшнім днём, забываючы і знішчаючы мінулае. Без мінулага няма будучага.

Патрэбна жыць, апіраючыся на вопыт продкаў, слухаючы іх парады "Шануйце дабрыню, хай і слабую. Шануйце мудрасць, хай сабе нямоглую. Насіце на руках сваіх бацькоў…" – заклікае Уладзімір Караткевіч.

Невялікая па аб'ёме гумарыстычная казка "*Чортаў скарб*" вучыць "не рабіць дурнога і не баяцца нікога". У казцы Караткевіч іранізуе з такіх якасцяў нашых людзей, як няўпэўненасць, нясмеласць, няўменне змагацца за сваё. Янку працай уцячы з хаты, кінуць сваю гаспадарку, чым даць адпор нячысціку.Героя ратуе выпадак. Ноччу мядзведзь, які заначаваў у хаце са сваім павадыром, так аддубасіў чорта, што той у хаце больш не з'яўляўся. А Янка так і не здагадаўся пра тое, хто яму дапамог. Цікавая думка: нас, беларусаў ратуюць, а мы часта не разумеем, ад чаго ратавалі і каму быць удзячнымі за гэта.

Пісьменнік вельмі чула ставіўся да лёсу свайго народа. У першай казцы "*Лебядзіны скіт*" ён уздымае праблему нацыянальнай свядомасці. І хоць было гэта "даўнымдаўно…", У. Караткевіч хутка пераходзіць да разваг пра свой народ, адлюстроўваючы розныя погляды на яго. Хан Батый кажа: "Народ – гэта статак, у якім кожная жывёла думае толькі аб тым, каб есці другіх і не быць з'едзенай". Юсуфі гаворыць: "Зараз яны

пяюць хвалу табе, заўтра – іншаму, а яшчэ праз пяцьсот год, а можа, і раней, люд будзе клясці цябе за тое, што ты вёў яго гэтым шляхам, поўным крыві і стогнаў". А старац кажа так: "Калі хоць адзін чалавек застаўся на роднай зямлі – яна не загіне".

Казка "Лебядзіны скіт" паказвае гісторыю старога Юсуфі, які коштам свайго жыцця выратаваў палонных ханам людзей. Юсуфі – прыклад чалавекалюбства і смеласці. Казачнік, як і належыць яму па прафесіі, верыць у тое, што дабро павінна перамагаць. І што ліхога чалавека можна зрабіць добрым

Казкі Уладзіміра Караткевіча самабытныя. Яны вучаць, як жыць сярод людзей, як трэба любіць радзіму, берагчы бацькоў, быць вернымі сябрамі. Аўтар дае нам урокі жыцця, якія мы, настаўнікі павінны выхаваць у сваіх вучнях . Мы па-рознаму ставімся да казак,бо яны маюць філасофскі змест. Але вельмі важна, што мы задумваемся над такімі сур’ёзнымі пытаннямі, што такое шчасце, любоў да роднай зямлі, вернасць сяброўству. Аўтар павучае нас, што ў кожнага ў жыцці свая дарога, кожны мае права выбраць свой шлях. Але перш трэба любіць тое месца, дзе ты нарадзіўся і вырас, тую мову, на якой гаварылі твае продкі.

А яшчэ аўтар дае нам зразумець, што заўсёды трэба слухаць бацькоў. Бо яны больш мудрыя і жадаюць сваім дзецям толькі дабра.

У ходзе даследавання мы высвятлілі, што літаратурныя казкі У. Караткевіча іграюць важную ролю ў выхаванні і развіцці дзяцей.Даследаванне аўтарскіх казак У. Караткевіча ўзбагаціла, пашырыла веды пра яго творы, якія аналізуюцца ў школьнай праграме. Мае аднакурснікі ў апытванні падтрымалі маё меркаванне аб вялікім выхаваўчым патэнцыяле казак У.Караткевіча, якія даюць незабыўныя ўрокі маралі, вучаць працавітасці, сумленнасці, сціпласці, душэўнай чуласці і дабрыні, актыўна ўплываюць на мову дзяцей, дапамагаюць адчуць прыгажосць роднага слова, мудрасць народа.

На жаль, анкета паказала, што некалькі навучэнак з казкамі Караткевіча незнаёмыя. Але і яны згадзіліся, што вывучаць іх неабходна. Таму ёсць патрэба акцэнтаваць важнасць мастацтва казкі і для грамадства, і для канкрэтнага чалавека. Яны прывіваюць пачуццё прыгожага. Казкі – гэта багатая крыніца маральных прынцыпаў і нормаў, важны курс педагагічнага выхавання.

Спіс цытаваных крыніц:

1. Алейнік, Л. Жыццѐ – не казка. Але ў казцы – падказка… // Полымя. – 2008. – 8. – С. 101–105.
2. Кабашнікаў К.П. Казкі // Беларуская вусна-паэтычная творчасць: падручнік для студэнтаў філал. спец. ВНУ / К.П. Кабашнікаў, А.С.Ліс, А.С. Фядосік і інш. - Мн., 2000.— 313с..
3. Кабашнікаў К.П. Сустрэчы з казкай : кніга для настаўніка / К. П. Кабашнікаў, Г. А. Барташэвіч. – Мінск: Нар. асвета, 1984. – 96 с.
4. Самойла, Г. Чароўны ліхтарык. Казка / Г. Самойла. – Гродна: ТАА–ЮрСаПрынт‖, 2013. – 64 с.
5. Шамякіна, Славяна. Беларуская літаратурная казка / Славяна Шамякіна // Полымя. – 2008. – № 8. – С. 92–97.

## РАЗВИТИЕ РЕЧИ ДЕТЕЙ ДОШКОЛЬНОГО ВОЗРАСТА СРЕДСТВАМИ ТЕАТРАЛИЗАЦИИ И ИГРЫ

**Артюхович А.Р., магистрант**
(г. Витебск, ВГУ имени П.М. Машерова)
Научный руководитель – Данич О.В., канд. филол. наук, доцент

Одной из основных психических функций человека, которая позволяет общаться, формирует убеждения, взгляды, играет роль в познании окружающего мира является речь. Одним из самых важных приобретений ребенка в дошкольном возрасте является развитая речь. Она рассматривается в современном дошкольном воспитании, как общая основа воспитания и обучения детей дошкольного возраста [1].



Репозиторий ВГУ